**УДК 39**

# АДРАДЖЭННЕ АЎТЭНТЫЧНАЯ КАЛЯНДАРНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

***А. С. ЦЫГАНКОВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У артыкуле разглядаецца традыцыйная каляндарная абраднасць беларусаў Падзвіння ў гістарычнай рэтраспектыве, параўноўваецца традыцыйны стан абрадаў з сучаснымі тэатралізаванымі святамі. Выяўляецца адпаведнасць сучасных сцэнарыеў тэатралізаваных святаў (у гарадах і вясковых клубах) традыцыйнаму канону па такіх крытэрыях, як склад удзельнікаў, фальклорна-спеўны кампанент і атрыбутыўны код свята. Крыніцай даследвання з'яўляецца аналіз матэрыялаў крыніц масавай інфармацыі, сцэнарыяў сучасных тэатралізаваных пастаноў у культурных установах Віцебшчыны, дадзеныя апытанак, літаратурных і этнаграфічных матэрыялаў. Шэраг палявых матэрыялаў, зафіксаваных у зоне Беларускага Падзвіння, уводзіцца ў навуковы абарот упершыню.*

***Ключавыя словы:*** *каляндарная абраднасць, установы культуры, тэатральная пастанова, традыцыйны лад жыцця.*

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца трывалы рост цікавасці да беларускай этнічнай культуры. У 1991 г., з набыццем дзяржаўнай незалежнасці Беларусі, працэсы дзяржаўнага Адраджэння і будаўніцтва набылі незваротны характар. Беларуская традыцыйная культура пачынае разумецца не толькі як прадмет даследвання спецыялістаў, але як неад'емны складнік механізма нацыянальнай самаідэнтыфікацыі [5, с. 4]. Рознабаковым вывучэннем традыцыйнай духоўнай культуры ў цэлым, і каляндарнай абраднасці ў прыватнасці, займаецца шэраг выбітных беларускіх фалькларыстаў, так напрыклад, Т.В. Валодзіна, Т.Б. Варфаламеева, Т.І. Кухаронак – гэта беларускія даследчыцы, якія падрыхтавалі серыю кніг: "Традыцыйнай мастацкая культура Беларусаў" у 6 т. прысвечаныя розным гісторыка-культурным рэгіенам Беларусі [2]. Даследчыкі Т.В. Валодзіна і Т.І. Кухаронак апублікавалі кнігу "Яравое жыта гаспадара кліча" [1]. Даследванне каляндарнай абраднасці беларусаў знайшло адлюстраванне ў вялікім аб'ёме публікацый, але ў большасці з іх амаль не звяртаецца ўвага на сучасны стан традыцыі і перспектывы яе захавання. Таму навізна даследвання заключаецца ў адказе на пытанне: "Ці магчыма аднавіць і захаваць традыцыйны абрад, у чым плюсы і мінусы новых форм рэпрэзентацыі?" Мэта даследвання – прааналізаваць існуючыя ў сучасны перыяд элементы традыцыйнай святочнай культуры, формы і метады яе выкарыстання.

Імклівыя працэсы сацыяльна-эканамічнага развіцця прывялі да ўніфікацыі розных сфер жыцця, у тым ліку і культуры. У сувязі з распачаўшыміся глабалізацыйнымі працэсамі этнакультурная спецыфіка асобных народаў губляецца, таму для розных краін свету першапачатковай задачай стала выяўленне ўнікальнасці і адметнасці нацыі ў сферы этнічнай культуры. У працэсе вывучэння тэмы становіцца відавочным, што элементы беларускай каляндарнай абраднасці функцыянуюць у наступных формах: аўтэнтычнай і рэканструяванай.

Пад канструяваннем традыцыйнай культуры маецца на ўвазе рэпрэзентацыя свят установамі культур і грамадскімі арганізацыямі. Галоўнымі асаблівасцямі дадзенай формы рэпрэзентацыі з'яўляецца, па-першае, перанос рытуальнай прасторы святкавання з прыроднай сферы (напрыклад, на Купалле – гэта ўзлесак, бераг ракі, возера): *"У нас возера ў Быкаўшчыне, там гара была, называлася Верхні замак, хадзілі там кастры жглі. На Купала ідзем туды, кастры жжем, і песні, і скачым…"*[3], у сацыяльную сферу (гарадскі парк, плошча, пляцоўка ва ўстановах культуры). Па-другое, спрашчаецца і скарачаецца атрыбутыўны код свята, напрыклад, фальклорна-спеўнай часткі, якая на сённяшні момант уніфіцыравана. У трэціх, прадстаўнікі культурных арганізацый працуюць так, як іх навучылі, з штучна ўведзенай мовай жэстаў, аднолькавымі строямі і правіламі ўзаемадзеяння з гледачамі, у цэлым рэпрэзентаваны фальклор выглядае аднародна і ярка, бо гэта часта патрабуе сцэна.

Разглядаючы сцэнарыі тэатралізаваных пастаноў дамоў культуры Віцебшчыны бачна, што сённяшняе грамадства далёка адышло ад традыцыйнага ладу жыцця, і народныя святы больш

[3] ФА ПДУ: зап. А. Цыганковай у 2021 г. ад Волкавай Тамары Мяфодьеўны, 1929 г. н. у аг. Бігосава, Верхнядзвінскага р-на.

не ўспрымаюцца ў якасці сімбіёза чалавека і прыроды, яны выконваюць забаўляльную функцыю [4] [5] [6] [7] [8]. Першасная магічна-аграрная прагматыка свята застаецца па-за ўвагай выканальнікаў і з цягам часу забываецца, на першы план выступае забаўляльная функцыя.

Пад аўтэнтычнай формай існавання каляндарнай святочнай культуры маецца на ўвазе імкненне да пераняцця, альбо рэканструкцыі традыцыйных звычаяў і абрадаў. Як правіла прадстаўнікамі аўтэнтычнай формы рэпрэзентацыі з'яўяюцца аматары беларускага фальклору, навукоўцы, прадстаўнікі фальклорных калектываў і аб'яднанняў. Галоўным адрозненнем ад канструявання традыцыі з'яўляецца выкарыстанне розных метадаў увасаблення фальклору: калі канструяванне традыцыі больш нацэлена на адаптацыю першакрыніцы, з магчымасцю выкарыстання аўтарскай інтэрпрэтацыі, то прадстаўнікі аўтэнтычнай плыні імкнуцца да трансляцыі абраду. Аднаўленнем мясцовай традыцыйнай каляндарнай абраднасці таксама займацца жыхары некаторых вёсак на тэрыторыі Беларускага Падзвіння, напрыклад, у выпадку з "Жаніцьбай Цярэшкі" спроба аднаўлення адбываецца ў в. Велеўшчына, Лепельскага раёна: носьбіты традыцыі, з дапамогай маладзевых фальклорных калектываў і дзеячаў культуры, на працягу 15 гадоў адраджаюць лакальную вясковую традыцыю.

Асноўныя змены, якія адбыліся з традыцыйнай культурай пад час яе рэпрэзентацыі:

1) Да новых функцый традыцыйных форм абраднасці можна аднесці: фармаванне адчування салідарнасці, патрыятызму, гонару за этнакультурную спадчыну, чаго не было раней, калі для земляроба актуальнай была магічна-аграрная прагматыка святаў.

2) Каляндарнае свята – гэта камернае свята вясковага соцыума, калі ўдзел прымала ўся вясковая грамада, цяпер жа гэта могуць быць выпадковыя ў прафесійным і сацыяльным плане людзі, аб'яднаныя агульным інтарэсам да беларускай этна-культурнай спадчыны.

3) Тэрыторыя Беларусі падзелена на 6 этна-культурных рэгіенаў, якія мелі свае асаблівасці абрадаў і звычаяў, таму раней каляндарная абраднасць існавала толькі ў лакальных формах, цяпер, з-за недахопу матэрыялаў, звяртаюцца да агульнаэтнічнай спадычыны (напрыклад, пры святкаванні Масленіцы на Падзвінні можна пачуць песні з Цэнтральнай Беларусі ці Пасожжа).

4) Адным з найменш захаваўшыхся ў жывым побыце і маладаследаванных рэалій традыцыйнай культуры Падзвіння з'яўляецца народны касцюм. Найбольш значнай працай па тэме з'яўляецца кніга Вольгі Лабачэўскай "Белорусский народный касцюм" [3].

Спрабуючы адказаць на пытанне: "Ці магчыма аднавіць кананічны абрад", трэба ўлічваць шэраг дадатковых фактараў, па-першае, значны ўдар па традыцыйнай культуры адбыўся ў савецкія часы, калі некаторыя савецкія навукоўцы спрабавалі звесці абрады і рытуалы да народных забаў, маўляў, што вяскоўцы спрабавалі разнастаіць свае цяжкае жыцце. Па-другое, прасочваецца недахоп лакальнага матэрыялу. Па-трэцяе, з-за адыходу ад традыцыйнага ладу жыцця, магічна-аграрная прагматыка, якая была пануючай для земляроба, страчвае актуальнасць для сучаснага чалавека, губляецца магічны сэнс рытуала, з-за чаго ен пераўтвараецца ў тэатральную форму.

Такім чынам, існуючыя формы рэпрэзентацыі культуры не могуць адрадзіць кананічны абрад, бо, немагчыма аднавіць традыцыйны лад жыцця. У дадзеным выпадку можна казаць пра спробу папулярызацыі культуры і пераняцця аўтэнтычнага сцэнарыя абраду, але для прадстаўнікоў вясковых і гарадскіх дамоў культур і арганізацый гэта перш за ўсе праца, якой іх навучылі, а для прадстаўнікоў аўтэнтычнай плыні – гэта спроба захаваць найбольш выбітныя кампаненты беларускай традыцыйнай культуры, якая з'ўляецца грунтам беларускай унікальнасці і адметнасці. Як слушна адзначае кіраўніца фальклорнага гурта Варган В.А. Емяльянчык: *"Адраджэнне эталонных рэгіянальных кшталтаў традыцыйнай культуры – сітуацыя праблемная, бо есць цэлая сфера прафесійнага мастацтва, прафесійных фальклярыстаў, якіх гатуе той жа самы Інстытут культуры, яны вывучаюць традыцыйную культуру, але больш арыентаваны на сцэнічнае мастацтва […]. Адбываецца адыход ад эстэтычных рэгіянальных канонаў. Што датычыцца аматараў аўтэнтыкі гэта не прафесійныя*

[4] Сцэнарый "Добры вечар добрым людзям!" ДК Азінскае Полацкага р-на, прадстаўлена загадчыцай Валынко А.М.

[5] Сцэнарый "Прыйшла каляда, адчыняй варата" СДК Гарадокскае Полацкага р-на, прадстаўлена загадчыцай Сушчык Г.В.

[6] Сцэнарый театралізаванага абраду «Коляды» ДК Кушлікі Полацкага р-на, прадстаўлена загадчыцай Семяньковай Т.П.

[7] Сцэнарый «Ноч малая, ды купальная» ДК Фарынаўскае Полацкага р-на, прадстаўлена загадчыцай Ключнікавай А.Г.

[8] Сцэнарый массавага гуляння "Масленіца" ДК Сенькаўскае Верхнядзвінскага р-на, прадстаўлена кіраўніцай фальклорнага гурта Марынскай Л.

*музыканты, якія займаюцца фальклорам як хобі, але аматарскі падыход так сама дае значны эфект […]. Так жа існуе аб'ектыўная праблема фінансавання"*[9].

На жаль, на сённяшні момант рэпрэзентацыя каляндарнай культуры ва ўстановах культуры Віцэбшчыны ў асноўным скажае кананічны абрад, і, на нашу думку, гэта робіцца ненаўмысна, бо, па-першае, прадстаўнікоў дамоў культуры так навучылі працаваць, па-другое, так склалася гістарычна, бо савецкая "улада, якая аб'яўляла сябе народнай, не магла абысціся без народнай культуры, таму штучна была створана школа Культпрасвета, з-за чаго народная культура была адрэдагавана і адшліфавана" [4]. Гэты адшліфаваны прадукт засланяе сапраўдны, і, на жаль, на сенняшні момант з'яўляецца паказчыкам беларускай культуры для шырокіх народных мас.

ЛІТАРАТУРА

1. Валодзіна, Т. В. «Ядраное жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 358 с.: іл
2. Варфаламеева, Т.Б. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка. – Мінск: Беларускаянавука, 2004. – 910 с.
3. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А. Лобачевская, З.И. Зимина – Минск: Беларус. Навука, 2009. – 279 с.: іл.
4. Olenfolk. Трагедия культпросвета [электронный ресурс]// YouTube. Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=MoSxfsinZxk. Дата доступа: 19.05 2021 г.
5. Полацкі этнаграфічны зборнік. - Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 2 / склад. А. У. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 332 с.

[9] (ФА ПДУ): зап. А. Цыганковай, у 2021 г. ад Емяльянчык Вольгі Антонаўны, у г. Полацк.